Анатолий Иосифович
Сташевский
Татьяна Иосифовна
Сташевская

# Светлы успамін пра Думічы

**Анатолий Иосифович Сташевский**
**Татьяна Иосифовна Сташевская**

# Светлы успамін пра Думічы

*http://www.litres.ru/pages/biblio_book/?art=73590818*
*ISBN 9785006962989*

## Аннотация

Кніжка беларуса, улюблёнага ў сваю Радзіму, вёсачку, вяскоўцаў з якімі прайшло дзяцінства, на абшарах роднага Капыльскага краю. Пра людзей, якія там жылі, іх звычкі, быт, святы, перамогі і дасягненні ў пасляваенныя гады.

# Содержание


ВЁСКА ДУМІЧЫ 9
РОЗДУМЫ 12
З УСПАМІНАЎ СТАШЭЎСКАЙ ТАЦЦЯНЫ 17
К ТАБЕ Я Ў ДУМКАХ ЗАЛЯТАЮ… 49
з Энцыклапедыі гісторыі Беларусі 63
Конец ознакомительного фрагмента. 67

# Светлы успамін пра Думічы

**Анатолий Иосифович Сташевский**
**Татьяна Иосифовна Сташевская**

© Анатолий Иосифович Сташевский, 2026
© Татьяна Иосифовна Сташевская, 2026

ISBN 978-5-0069-6298-9
Создано в интеллектуальной издательской системе Ridero


Сташэўскі Анатоль
Сташэўская Таццяна
Светлы ўспамін
ПРА
ДУМІЧЫ

# СТАШЭУСКІ А.

Чытай і не забывай
пра родны кут, які дай
табе светкі у жыццё

А. Сташэўскі

Сташевский Анатолий Иосифович

* * *

Вясна і лета 2025 года былі вельмі знамянальнымі:

– мне споўнілася 70 гадоў (дата нараджэння 20.06.1955);

– «залатое вяселле» (дата шлюбу 19.05.1975).

Самым выдатным падарункам для гэтых падзей было выданне кнігі «Светлы ўспамін пра Думічы» (06.2025).

Выказваю вялікую падзяку тым, хто дапамагаў мне ў напісанні кнігі:

– маёй сястры Сташэўскай Таццяне.

У састаўленні электроннай версіі:

– унукам Мілашэўскаму Канстанціну, Мілашэўскай Лізавеце.

У выданні кнігі:

– сыну Сташэўскаму Дзмітрыю і яго сям'і: Сташэўскай Людміле, Сташэўскаму Антону, Сташэўскаму Анатолю;

– а таксама настаўніцы Возерскай сярэдняй школы Цялюк Таццяне Іванаўне.

Праз маё жыццё Думічы прайшлі як светлы, неўміручы запавет жадання жыць!

## ЗМЕСТ

Вёска Думічы ........ 3
Роздумы ........ 6
*«З успамінаў Сташэўскай Таццяны»* ........ 7
Мне душу смуткам напаўняе ........ 14
К табе я ў думках залятаю ........ 22
Гістарачны экскурс ........ 29
Пра вяскоўцаў ........ 52
*«З успамінаў Сташэўскай Таццяны»* ........ 53
Няма таго, што раньш было... ........ 55
Каталіцызм і Праваслаўе ........ 61
Свята-Траецкая Царква ў в. Цялядавічы ........ 62
Нясвіж ........ 65
Успаміны дзяцінства ........ 66
Святы ........ 68
*«З успамінаў Сташэўскай Таццяны»* ........ 68
Родина (Из книги «Мой путь») ........ 76

**СТАШЭУСКАЯ Т.**

**Светлы успамін пра Думічы**

**Памяці землякоу, якіх ужо няма,**
**і іх нашчадкам, што будуць жыць…**

# ВЁСКА ДУМІЧЫ

**За акном ужо студзень 2023-га года. Ідзе снег, неба пасвятлела, у паветры адчуваецца невялікі мароз. Выйшаў на вуліцу падыхаць свежым паветрам, «размяць косці» пасля ночы, пагаварыць з кім-небудзь. Сустрэўся з суседам, дарэчы, ён мой зямляк – з вёскі Падлужжа, што на Капыльшчыне.**

**– Ну, як там нашы капыляне пажываюць? – пытаюся ў яго. – А вось ніяк. Ездзіў на радзіму ўчора, на могілкі да маіх бацькоў. Была патрэба пагаварыць з імі, неяк палягчэла. Але вельмі здзівіла мяне мая вёсачка. Яна не такая ўжо і маленькая, налічвае больш за шэсцьдзясят хат, і за ўвесь час, што я там прабыў (а гэта гадзін са тры), не сустрэў ніводнага вяскоўца. Я не ведаю, колькі там чалавек пастаянна жыве, але ж хто-небудзь павінен быў з'явіцца на вуліцы па сваіх патрэбах. І, на дзіва, нікога не было. Дзе ж яны падзеліся? Хутчэй за ўсё, што жывуць там лічаныя сталыя пенсіянеры.**

**Доўга мой сусед распавядаў мне пра жыццё Падлужжа ў савецкія часы, пра жыццё, багатае на падзеі, у вясёлым, цікавым, імклівым развіцці. У вёсцы раней жыло шмат людзей. Нараджаліся, працавалі, дасягалі поспехаў… На жаль, усё гэта было, а сёння вёска вы-**

**мірае.**

**Дарэчы, усяго ў Капыльскім раёне 208 вёсак, пры гэтым, у 13 сёння ўжо ніхто не жыве. І калі ў кінутых вёсках не адновіцца жыццё, то яны, хутчэй за ўсё, знікнуць з карты Беларусі. А колькі такіх вёсак, дзе жывуць па пяць-дзесяць пенсіянераў?**

**Сум ахапіў мяне: гэта ж гадоў праз пяць-дзесяць можа застацца без жыхароў і мая радзіма – вёска Думічы. Сёння там пакуль што жыве каля 30 чалавек, у тым ліку і мая малодшая сястра Таццяна.**

**Многа гадоў мяне не пакідае думка пра страту беларусамі сваёй гістарычнай памяці. Шмат чаго адбылося па незалежных ад нас, беларусаў, абставін, але ж вельмі многае залежыць і ад нас саміх. Хто нам перашкаджае выхоўваць ў душах нашых дзяцей павагу да мінулага родных мясцін, гаварыць нашчадкам праўду пра здабыткі, перамогі і страты нашых продкаў? Гэта не так ужо і цяжка, патрэбна толькі жаданне і, несумненна, любоў да малой радзімы. І вось вам першы адказ на мае сумненні: я дакладна ведаю, што ў Лясноўскай сярэдняй школе сёння няма ні школьнага музея, ні больш-менш сабраных і прадстаўленых матэрыялаў пра гісторыю ўзнікнення і развіцця вёсак Думічы і Лясное (Колы), царквы ў в. Цялядавічы і многае іншае. А ў гэтай вёсцы вучацца дзеці тых бацькоў, што пабудавалі ўсё, што ёсць у былым саўгасе «Ляс-**

**ное» (сёння саўгас «Лясное» аб’яднаў таксама саўгас «Бабоўня» і «Луч»).**

**Цяжка ўсведамляць гэта, праўда! Вось і рашыў я прыкласці асабістыя намаганні да захавання памяці пра жыхароў вёскі Думічы – землякоў маіх бацькоў. І памагаць у гэтай справе згадзілася мая сястра Таццяна, якая жыла і працавала ўсё жыццё ў Думічах. І лепш за яе мне мала хто дапаможа. Вось так і нарадзілася гэта кніга.**

# РОЗДУМЫ

**Чым далей я паглыбляюся ў былое і дабіраюся да падзей, якія суправаджалі маё дзяцінства, тым больш блытанымі і няпэўнымі робяцца мае ўспаміны. Большасць з іх, хутчэй за ўсё, было распавяданы тымі, хто з любоўю і ўвагай пазіраў на мае першыя крокі. Шмат чаго са мною і не было зусім, а пачутае ці прачытанае калісьці вельмі моцна прыкіпела да маёй душы. Хто скажа, дзе ў гэтых успамінах заканчваецца сапраўдны бок, а дзе пачынаецца казка, ператвораная ў звыклую ісціну, і дзе, нарэшце, мяжа, на якой праўдзівае і прыдуманае гэтак мудрагеліста зліваюцца?**

**Да пяцідзесяці гадоў мае галоўныя жыццёвыя імкненні былі звязаны з будучым. Паўсядзённыя праблемы я стараўся хутчэй рашаць і аб іх забывацца. А пра тое, што мінула, і думаць не было калі. І вось толькі ў сталым узросце мне ўсё больш прыходзяць на роздум пражытыя гады: дзяцінства, маладосць… Дарэчы, у сувязі з гэтым ёсць вельмі мудрая прымаўка: «Маладыя могуць марыць, а пажылыя толькі ўспамінаць»…**

**І ўсё часцей да мяне прыходзяць успаміны пра даўно забытыя падзеі і людзей, звязаных з імі. Перад вачыма, як жывыя, стаяць вяскоўцы і сябры, на якіх я**

**даўно забыўся і ніколі не ўспамінаў. Быццам кадры кіно змяняюць адзін за адным дні, гады, пражытыя ў роднай вёсцы. Светлая радасць ахоплівае мяне, але часцей на душы застаецца пячатка таго, што ўжо «няма таго, што раньш было!»**








## Сташэўскі Анатоль

# З УСПАМІНАЎ СТАШЭЎСКАЙ ТАЦЦЯНЫ

**– Думічы – родная вёска, у якой я нарадзілася. Тут прайшлі гады майго дзяцінства, тут я хадзіла ў школу з першага па чацвёрты клас, з чацвёртага па восьмы клас – у Дарагавіцкую васьмігадовую школу, дзесяць класаў заканчвала ў Лясноўскай сярэдняй адукацыйнай школе. З цеплатой і хваляваннем успамінаецца ўсё наша дзяцінства.**

**У хаце было восем дзяцей. Бедная наша мама Гэлька ніколі на адпачывала. Раніцай паліла ў печы, бо трэба было ўсім нам прыгатаваць сняданак і паставіць у печ абед. На снеданне мама гатавала мачанку з бульбай або яечню. А на абед ставіла капусту з гусяцінай, тушыла бульбу. Амаль кожную нядзельку пякла аладкі і ставіла чыгунок (літраў на пяць) з мачанкай і грыбамі. Калі хапала часу, дык пякла сухарыкі з аржанай мукі. Яны былі такія смачныя, што яшчэ і цяпер хочацца іх не тое, што з'есці, а хаця б паглядзець на іх, адчуць пах і асалоду таго часу.**

**Колькі я сябе памятаю, мне здаецца, што я ніколі не адчувала сябе сытай, заўсёды хацелася есці. Гэта было не адчуванне голаду, а жаданне паесці. Яно мяне**

**заўсёды падштурхоўвала рухацца, жыць.**

**Раніцай, калі ў печы пякліся скварачкі, дык заўсёды іх было столькі, колькі едакоў у хаце. А самая тоўстая скварка была татава. Мама заўсёды казала: «Дзеткі, бацька ж цяжка працуе, і яму патрэбна скварка большая». Вось так і жылі. Таму я і цяпер стараюся, каб у мяне заўсёды быў запас мукі, солі, цукру, крупаў. На зіму заўсёды раблю мноства «закрутак». Гэта і агуркі, і памідоры, кампоты, рознае варэнне.**

**Але ў жыцці ўсё змяняецца. Сёння ў нашай вёсцы няма ніводнай каровы. Нельга паверыць, што зусім нядаўна ў Думічах у кожнай сядзібе была карова, нашы жанчыны-даяркі хадзілі ў саўгасныя кароўнікі карміць і даіць паўтысячы кароў. А сёння ў вёсцы і шклянкі сырадою не знойдзеш! Лапуці, Лагошы, Жыбуртовіч яшчэ трымаюць свіней, некаторыя пенсіянеры маюць пяць-дзесяць курачак. Майму ўнуку Арсенію ўжо 10 гадоў, а кароўку ён бачыў толькі па тэлевізары. Некалі дзеці гулялі на выгулах з мячыкам, прыгалі са скакалкай, з пясочку будавалі домікі, на дарозе гулялі ў «класікі». Улетку, дарэчы, і сёння ў Думічы заязджаюць з гарадоў дзеці на канікулы, але яны больш па хатах сядзяць у нейкіх «цік-токах». Выйдзеш на вуліцу – нідзе няма нікога, цішыня, і толькі калі-небудзь прабяжыць па вуліцы сабачка, які сам шукае сабе сяброў. Некалі яшчэ толькі днее, а ва ўсіх**

**хатах ужо гарыць свет, гаспадыні паляць у печы, і з кожнага коміна дым ідзе слупам у неба. Сёння ад нашага дома да Будрыкаў у адных Высkваркаў гарыць свет, а дыму з коміна забылася калі і бачыла… Як вы думаеце: жыццё стала лепшым, жыць стала весялей?**

**Канешне, жыццё назад не вернеш, ды і не надта хочацца вяртацца, як успомніш, колькі мы тады працавалі. Цяпер добра жыць: свет гарыць, тэлевізар ідзе, мікрахвалёўка і хуткаварка ёсць, газавая пліта гарыць лепш за печ. Ад здабыткаў цывілізацыі грэх адказвацца, яны значна аблегчылі наша жыццё. Але навошта мы адказаліся ад нашага радаснага дзяцінства, калі ўся дзетвара разам гуляла, купалася ў рэчцы, калі сем’ямі хадзілі ў лес у ягады і грыбы. Шкада, што нашы ўнукі не паспрабуюць той радасці і таго шчасця, якое давала нам адчуванне адной сям’і, супольнасці ўсіх жыхароў вёскі. Як цудоўна было ўсім «канчанам» збірацца ля рэчкі, каля драўлянага моста на купальні. Чысценькая імклівая вадзічка, не надта цёплая, але і не халодная, агортвае тваё цела, лашчыць рукі, твар. Гэткая асалода, словамі не перадаць! Купальня ўся па берагах пакрыта квітнеючымі белымі і жоўтымі гарлачыкамі. Глядзіш на гэткае хараство, здаецца, руку працягні – і яно тваё, і хочацца жыць вечна, жыць і радавацца дзень і ноч. Гэта не толькі мае думкі, з такімі пачуццямі тады жылі ўсе мае сяброўкі, гэта праў-**

**да жыцця.**

**На левым беразе Выні, за мастом, рос старадаўні магутны дуб. Якраз пад ім моладзь часта спраўляла вячоркі з вогнішчам, смажанай рыбай, салам і бульбай. Няма ўжо ні рэчкі, ні маста, ні дуба, ні купальні. Замест ракі цяпер голая канава, цераз якую перакінуты бетонны мост. Вадзічка цячэ, гамоніць, але ніхто ў ёй не купаецца, не ловіць печкуроў, не збірае гарлачыкі для дзяўчат.**

**Змянілі прыроду і лад жыцця самі людзі. Яны хацелі, каб усё было лепш, але, як заўсёды, стала «хреново».**

**Бывала, Лазарэвічы ці Ксяневічы заколюць кабанчыка, дык вечарам на свежаніну збіраліся ўсе суседзі. Адзін аднаму абавязкова прыносілі свежаніну. Цяпер жа не чуваць па вёсцы віску свіней, адышлі ў небыццё свежаніна і пасядзелкі. Хаты думічане пачалі зачыняць на замкі, хадзіць да суседа на гутарку сталі ўсё менш. Не ўбычыш сёння пенсіянераў, якія раней сядзелі на лавачках пры кожнай хаце, увогуле нікога не ўбачыш. Сталі прападаць і лавачкі….**

# БЕЛОРУССКАЯ ШЛЯХТА
## Сташевский
## Staszewski
## 1400



**Герб**
**ОСТОЯ (OSTOJA)**
**Легенда герба**

В 1069 г. Болеслав Смелый дал герб Остоя отважному рыцарю. Рыцарь этот захватил передовой отряд врагов поганых, и один из пленных обещал ему, присягнув на солнце, что в обмен на свободу и герб поможет уничтожить весь отряд. Возвратился он к своим, успокоил их, сказав что в окрестности нет поляков, и направил войско поганых в засаду, организованную Остоем. Когда они подошли, силы Остоя окружили врагов и уничтожили их. В награду Остоя получил герб с двумя полумесяцами и мечом.

Остоя – один из наистарейших шляхетских гербов.
Печати с гербом Остоя известны с конца XIV века.
Гербом пользовались более 200 шляхетских родов.



# Сташэускі Восіп Герб сям’і Сташэускіх



ГРАМОТА

МИНСКОЙ ГУБЕРНИИ ОТЪ ГУБЕРНСКАГА ПРЕДВОДИТЕЛЯ ДВОРЯНСТВА И УѢЗДНЫХ ДВОРЯНСКИХЪ ВЫВОДОВЫХЪ ДЕПУТАТОВЪ СОБРАННЫХЪ ДЛЯ СОСТАВЛЕНІЯ ДВОРЯНСКОЙ РОДОСЛОВНОЙ КНИГИ, ДВОРЯНИНУ **ГЕРБА ОСТОЯ СТАШЕВСКОМУ** ОТ РОДОНОЧАЛЬНИКА ВЫВОДЯЩИМСЯ ДАННАЯ.

Рассмотрѣвъ на основаніи ВСЕМИЛОСТИВѢЙШЕ пожалованной отъ блаженныя и вѣчной славы достойныя памяти ГОСУДАРЫНИ ИМПЕРАТРИЦЫ ЕКАТЕРИНЫ II, в 11 день Апреля 1785 года Грамоты, предъявленныя отъ упомянутого Сташевского о Дворянскомъ его достоинствѣ доказательствы, признали оныя согласными съ предписанными на то правилами; въ силу коихъ соотвѣтственно 8а Статьи вышеизъясненной Грамоты, он и род его внесенъ в Дворянскую родословную Минской Губерніи Книгу Шестую ея часть. Во свидѣтельство чего МЫ Губернскій Предводитель Дворянства и Депутаты во исполненіе ВСЕВЫСОЧАЙШЕГО ЕГО ИМПЕРАТОРСКОГО ВЕЛИЧЕСТВА ГОСУДАРЯ ИМПЕРАТОРА АЛЕКСАНДРА ПЕРВАГО соизволенія, дали ему сію Грамоту за подписаніем нашимъ, утвердив оную Печатью Дворянскаго Собранія Минской Губерніи. Дана въ Губернскомъ Городѣ Минскѣ Іюля 23 1807 года.

*Предводитель Дворянства Минской Губерніи, Статскій Совѣтникъ и Орденовъ Св. Анны 2 Класса Кавалеръ и Св. Іоанна Іерусалимскаго Командоръ*



**Сташэускі Анатоль Сташэускі Валодзя**


СТАШЕВСКИЙ
STASZEWSKI
1400
ГЕРБ
ОСТОЯ (OSTOJA)

# Герб сям’і Сташэўскіх




**Сташэуская Таццяна, Сташэуская Аня, Ляхоускі А.,**

# Рымашэўскі Іван каля хаты Рымашэўскіх





# Радавая хата сям'і Сташэускіх

## Сташэускі Валодзя Сташэуская Валя









**Сташэускі Міша Сташэускі Анатоль**



**Крыкала Валя і Шыманская Аня**

**Жанідзбьа Серадзінскага Вані**





Зяньковіч Галя, Серадзінская Таня, Астрэйка Ліда, Сташэуская Таня, Шыдлоуская Валя і Шымано-ускі Юзаф Сташэуская Таня, Любэцкі Іван, Любэцкая Людвіся

## МНЕ ДУШУ СМУТКАМ НАПАЎНЯЕ…

Назва любой вёсачкі мае пад сабой гістарычнае альбо выпадковае паходжанне. Вёска Думічы вельмі ўдала размясцілася паміж ракой Выня, вытокам знакамітай ракі Нёман, і шасэйнай дарогай «Баранавічы-Асіповічы». Дарога існавала задоўга да савец-

**кіх часоў і ў Расійскай імперыі мела стратэгічнае значэнне. Трэба прызнаць, што пры Вялікім Княстве Літоўскім патрэбнай увагі дарогам не надавалася. Дарожная справа была ў вядзенні мясцовых землеўладальнікаў, падтрымка дзяржавы была нязначная. Пасля таго, як Расійская імперыя падпарадкавала сабе вялізныя тэрыторыі, адразу значнасць дарог узрасла. Як вы ведаеце, у Расіі дзве бяды: дурні і дарогі, і карані гэтых бед цягнуцца якраз з тых часоў. І вось у канцы XVII стагоддзя і пачалося будаўніцтва шасэйнай дарогі «Баранавічы-Асіповічы».**

**Рака Выня працякае на тэрыторыі Нясвіжскага і Капыльскага раёнаў, з'яўляецца левым прытокам ракі Лоша недалека ад упадзення яе ў Неман. Даўжыня ракі – 56 км, вытокі ракі – у Нясвіжскім раёне, але большая частка поймы размешчана ў Капыльскім раёне. Дзесьці ў канцы сямідзясятых гадоў у пойме ракі была праведзена меліярацыя. Асушэнне Палесся, якое пачалося ў шасцідзясятыя гады пры П. Машэраве, дакацілася і да Выні. Калі ў пойме рэк Прыпяць, Сож, Днепр, Дзвіна і некаторых іншых рэк мела сэнс праводзіць меліярацыю, уводзіць у сельскагаспадарчы зварот палепшаныя сенажаці і пасевы, то зусім памылковым стала выпростванне ў меліярацыйныя канавы натуральнага русла ракі Выня і вялікай колькасці ручайкоў, крынічак. Ды і балацін у пойме ракі амаль**

**што не было. Былі вялікія вясеннія разлівы на месяцы два, а таксама ў дажджлівую восень.**

**У савецкія часы партыя і ўрад штодзень сцвярджалі пра павялічаныя ўраджаі зернавых і нарыхтаваныя кармы для жывёлы. Але ж нядоўга шчасце было, з развалам Савецкага Саюза забыліся пра меліярацыю і калгасы. Але справа была зроблена і былога не вернеш. Колькі страт панесла Беларусь, і яе жыхары, і яе прырода ад неабдуманых учынкаў нашых знакамітых кіраўнікоў? Ніхто не лічыў, ды і навошта лічыць. Нашы вялікія дзеячы не памыляюцца, гэта выканаўцы іх геніяльных ідэй усё сапсавалі на месцах.**

**Калі ў Расіі заўсёды былі і ёсць дзве бяды – дурні і дарогі, дык у Беларусі расійскі ўплыў нарадзіў адну бяду: дурняў! І сёння ў Беларусі ва ўладзе іх нямала…**

**Зусім нядаўна, у 2017 годзе, Капыльская ПМК зноў правяла спрауленне, паглыбленне Выні і знішчэнне ўсёй расліннасці на берагах. Наша рачулка ўжо амаль ажыла, пачала напаўняцца багаццем расліннага і воднага асяроддзя. Дарэчы, гэткія малыя рэчкі маюць вялікае экалагічнае і рэкрэацыйнае значэнне, яны галоўны па эстэтычным уздзеянні элемент прыроды. Там фармуецца чыстае паветра і мікраклімат, якія маюць аздараўленчае ўздзеянне на арганізм чалавека. Малыя рэчкі даюць жыццё вялікім рэкам. А колькі радасці, шчасця, здароўя, гадоў жыцця даюць нам ра-**

**чулкі!**

**Праз жыццё кожнага думічаніна шырокую дарогу праклала нешырокая, маўклівая, сціплая, дарагая нам малая рака Выня. Успамінаючы сваё дзяцінства, я ўпэўнена сцвярджаю, што большую палову свайго вольнага часу я правёў на рэчцы. Цяперашнія дзеці скажуць: «Цікава, і што гэта вы цэлымі днямі рабілі, чаго вы туды бегалі, што цікавага вы там бачылі?». Ды і чаго туды бегаць, калі дастаткова адкрыць інтэрнэт, націснуць на клавішу – і перад табой на экране ўся прыгажосць лясоў і рэк, тысячы дробязей пра рост, цвіценне самых экзатычных кветак, яблынь, ды, наогул, чаго хочаш. І гэта ўсё перад табой, размалявана і распісана даступна, зразумела… Згаджаюся з вамі… Але ўсё гэта вы бачылі, чулі, седзячы ў кватэры перад экранам. Як нявольнік у турме… Вы ўсё гэта бачылі, аде не бегалі босымі нагамі раніцай па халоднай расе, не спрабавалі на смак смажанай на вогнішчы свежай рачной рыбкі, не ганялі да знямогі на canьках-снягурках, прывязаных да валёнак. Не давядзецца вам адчуць тую паўнацэнную радасць і шчасце ад яднання маладога, здаровага цела з прыродай, яе неймавернымі багаццем, разнастайнасцю, каларытам колераў і гукаў.**

**Мне не хочацца варочаць вас да мінулых (нашых!) гадоў, але мне вельмі шкада, што шмат цудоўных**

звычак, магчымасцей вы ўжо ніколі не паспрабуеце. На жаль, разам з кепскім знікае і многа цудоўнага, выдатнага. Мне вельмі хочацца, каб моладзь зразумела мяне. Так, жыццё нельга затрымаць. Кожны дзень будзе прыносіць новыя звычаі і правілы жыцця. Вам патрэбна навучыцца фільтраваць, выбіраць каштоўнае, патрэбнае для далейшага жыцця, для вашых дзяцей і ўнукаў.

Прызнаюся, у майго пакалення (ды і маіх бацькоў) гэта не вельмі добра атрымлівалася. Мінулае стагоддзе прынесла чалавецтву шмат слёз, крыві і страт. Дай бог, каб жыццё стала лепшым…

Вернемся да ракі… Зіма. Адразу пасля школы, на хуткую руку схапіўшы са стала сала з хлебам і малаком, дзятва пры добрым надвор'і ляцела на раку, там іх чакала хакейная пляцоўка. Хлопцы (а часцяком і дзяўчаты) дзяліліся на дзве каманды і ганялі шайбу па дзве-тры гадзіны да перамогі. У Думічах на рацэ было 2—3 пляцоўкі для хакея: «канчане» рабілі пляцоўку на бродзе супраць агародаў Лазарэвічаў-Сташэўскіх, а асяродкаўцы – на «пераправе» каля магазіна. Гулялі да цемнаты, а бывала, і бацькі нас прыганялі да хаты рабіць урокі ды дапамагаць па гаспадарцы.

У канцы кастрычніка-пачатку лістапада прыходзілі першыя маразы. Пры бясснежным надвор'і за трычатыры дні рака пакрывалася лёдам. Прыходзіла па-

ра «глушыць рыбу». Галоўнае патрабаванне было, каб лёд быў чысты і роўны, здольны трымаць на сабе два-тры чалавекі. Старэйшыя нашы браты рыхтавалі для гэтага кувалду-глушылку. Рабілася яна з бервяна дыяметрам сантыметраў на 25—30 і даўжынёй на 40, да яе прымацоўвалі ручку даўжынёй да метра. І вось гэты інструмент уручалі самаму спрытнаму і моцнаму хлопцу. Трэба было ісці па лёдзе, лепш неглыбокіх месцах, дзе няма хуткага цячэння вады, уважліва глядзець і, убачыўшы рыбку, стукнуць кувалдай па лёдзе. Біць трэба з разлікам на тое, каб з першага ўдару прабіць лёд. Заставалася хуценька злавіць ужо нерухомую рыбку. Калі цячэннем адганяла рыбку ўбок, то трэба прабіваць іншыя дзіркі ў лёдзе па цячэнні і лавіць рыбку. Часцей за ўсё гэта былі плоткі, краснапёркі, акуні памерам з далонь. Пападаліся і большыя… як калі, але ў асноўным з гадзіны дзве-тры набіралася поўнае вядро рыбы. Заўважце, зімой мець вядро свежай рачной рыбы – цудоўна, праўда? Рыбу дзялілі на ўдзельнікаў, штосьці перападала і гледачам.

Калі цяпер я расказваю пра тое, як мы глушылі рыбу на Выні, дык на мяне глядзяць як на дурнога. Не верыць ніхто, што гэтак можна было лавіць рыбу. Бачыце, колькі тут часу прайшло, а цікавы звычай думічан знік беззваротна. Ды ці ён толькі адзін, шкада. Няма таго, што раньш было…

**Летам усё жыццё вескі праходзіла каля ракі, і малых, і дарослых. Паміж агародамі «канчан» і ракой ад моста да лагчынкі паміж хатамі Жыбуртовічаў і Цвілевічаў ляжаў цудоўны лужок. Ён карміў і паіў усіх жыхароў..**

**Эх, луг шырокі! Як жывы, ты,**
**Травой мурожнаю закрыты,**
**Стаіш зялёны прада мною.**
**І ззяеш дзіўнаю красою!**
**Я. Колас «Новая зямля»**

**Раніцай, з усходам сонца, гаспадыні ўставалі даіць каровак. Цёплы сырадой з вялікім смакам спажывалі старыя і малыя. Дабаўце да яго кавалак чорнага хлеба або слуцкага батона, пасля смажанага сала з яечкам альбо мачанкі з блінам – і любы працаўнік з добрым настроем ішоў на працу ў поле.**

**Пасля дойкі каровы адна за другой выходзілі на вуліцу, дзе іх чакаў пастух. Чаргу адбывалі па хатах па парадку. Калі ў каго здараліся якія-небудзь складанасці, то можна было і наняць пастуха сярод моладзі. Статак выганялі на пашу да рэчкі. Дарэчы, пасвіць каровак часцей за ўсё прыходзілася нам, вучням 5-9-х класаў, хлопцам і дзяўчатам. Справа гэта была не вельмі цяжкая і складаная, бо побач была цёплень-**

**кая і чысценькая рачулка… І калі сонца добра прыпякала, то мы дазвалялі нашым «карміліцам» зайсці ў раку ў брод, каб ахаладзіцца ды папіць вады. Ды і пастухі не супраць былі паплюхацца каля вады. Самотна было цэлы дзень круціцца каля статка, хацелася пабегаць на свабодзе, але на прыродзе з купаннем, сонечным загарам дні пралятлі неўзаметку.**

**Ніяк не выходзіць з памяці яшчэ адна старонка жыцця вёскі – гэта вырошчванне гусей на падвор'ях думічан. А былі гусі ў абсалютнай большасці гаспадарак, ад 10 да 50 птушак. Гусі – гэта вадаплаўная птушка, для жыцця якой патрэбна шмат чыстай вады і прасторны выгул з травой. Усяго гэтага было ўдосталь у пойме ракі Выні. Вельмі добра было тое, што месца нашых птушак было поруч з падворкамі. Гусі – гэта птушкі, якія жывуць на лугавых прасторах, шпарка ходзяць і бегаюць, добра лётаюць і плаваюць на вадзе. Асноўнай ежай для іх з'яўляецца трава, не грэбуюць злакамі, лісточкамі, насеннем. Лічыце: птушка за кошт прыродных крыніц без вялікіх затрат за 8 месяцаў давала каля 6—8 кг цудоўнага мяса. Безумоўна, вечарам пасля нашых птушак кармілі і падкормлівалі зернем з абмешкай, але гэта было восенню, перад забоем птушак. Вялікае багацце давала птушка кожнай гаспадыні ў выглядзе пер'я. Цяжка сказаць, колькі гадоў чалавецтва карыстаецца пухо-**

**вымі вырабамі для падушак, але і да нашага часу чалавецтва спіць на падушках з пяра. Калі каўбаса, дык з мяса, а калі падушка – з пяра і пуху. І цудоўна жылося, праўда?**

**Падушкі з гусінага пяра пругкія, зносаўстойлівыя, лёгкія, мяккія, служаць людзям многія дзясяткі гадоў, карыстацца імі – вялікае задавальненне. А якое гэта ўпрыгожванне для кожнай хаты! Маладыя дзяўчаты да свайго шлюбу сваімі рукамі ўпрыгожвалі вышыванкамі навалочкі для падушак на пасаг. Люба было глянуць на цэлыя пірамiды падушак розных памераў на ложках думічан.**

**Гусі, і святочныя перадпавагоднія сталы з бульбай і мяснымі стравамі, і цудоўныя падушкі – усё гэта праклала ў маім жыцці светлую палоску. Мне здаецца, што гэтак думае большасць маіх аднагодак-думічан. Яшчэ і сёння нашы ложкі ўпрыгожваюць падушкі, якія некалі з нашай дапамогай нарадзіліся ў нашых родных Думічах.**

**Не адзін раз летам старэйшыя хлопцы збіралі гурт, каб лавіць рыбу невадам ці «таптухай». На невад патрэбна было чалавек пяць-шэсць. У асноўным невад зацягвалі на шырокім бродзе, дзе дно было роўнае і без багавіння. Пачыналася лоўля з таго, што па трое-пяцёра хлопцаў заходзілі ў рэчку з левага і правага бакоў броду і з шумам ішлі, гналі ўсю рыбу да невада,**

**які зацягвалі цераз увесь брод до процілеглага берага. Амаль што заўсёды выцягвалі вядро плотак, печкуроў, акунёў і нават шчупакоў. Гэткую маштабную лоўлю рыбу рабілі не часта, у свята або пасля сенакосу ці сканчэння якой вялікай справы. Пад вечар на беразе ракі на лужку распальвалі вогнішча, смажылі скваркі.**

**Летам асабліва не было калі гуляць, трэба было цэлымі днямі гнуць спіну на палетках калгасных і сваіх, і вось такі адпачынак ладзілі сабе думічане. З заходам сонца збіралася моладзь са старэйшымі, брала з сабой гарманіста, і да поўначы ля ракі гучалі песні, смех дзяцей, радасць, шчасце, жыццё вітала над вёскай.**

**Мне цяжка ўтрымаць пачуцці аб тых благаславёных, шчаслівых дзянёчках нашага жыцця, слёзы льюцца самі, няма сіл стрымаць іх. Ды і не хочацца трымаць пры сабе радасць ад усведамлення сапраўды цудоўных, недарма пражытых табой гадоў.**

**Мой родны кут, лугі, крыніца!**
**Цяпер для вас я – чужаніца.**
**Той самы лес, палеткі тыя,**
**Ды людзі там жывуць другія.**
**Мне душу смуткам напаўняе,**
**Што ў прошласть канулі гадочкі,**
**Мае шчаслівыя дзянёчкі,**
**Прайшла, вясна там маладая!**

**Я. Колас «Новая зямля»**

**Пасля меліярацыі поймы Выні знікла не толькі яе рэчышча, знікла і мноства звычак жыхароў. Старэйшыя яшчэ памятаюць, як лавілі рукамі ракаў на поплаве, ля рэчкі. Зусім невялікая кампанія хлапчукоў за гадзіну магла налавіць два вядры ракаў. А потым, зварыўшы на вогнішчы, усе маглі паспрабаваць ласунак з рачных ракаў, якіх цяпер не знойдзеш у самых шыкоўных рэстаранах. Нашы хлопцы, асабліва закаханыя, маглі падарыць сваёй дзяўчыне белую ці жоўтую лілею. На нашай Выні былі мясціны, дзе ўся рака пакрывалася плывучымі па вадзе сэрцападобнымі круглымі лістамі з кветкамі. Дарэчы, назва «лілея» пайшла ад грэчаскага «німфа», што азначае «лялечка». У лілеі вельмі карысным і смачным было тоўстае, паўзучае па дне каранішча. Дзятва нырала за ім, рвала рукамі, ачышчала і са смакам спажывала. Гэткім жа чынам здабывалася і каранішча аеру – рачной і балотнай лекавай расліны. Яшчэ некалі старажытны лекар Авіцэна выкарыстоўваў аер для лячэння многіх хвароб, а думіцкія дзецi, не ведаючы пра лекавую карысць расліны, спажывалі яе як дабаўку да небагатага стала хлебароба.**

**Маё пакаленне яшчэ мела шчасце плаваць па рацэ на чоўне, лавіць з яго на вуду плотак. На нашым**

**бродзе было некалькі чаўноў, розных па памерах. Такі плывучы сродак вырабляўся вельмі спрытным майстрам з дубу, ліпы, сасны. Служылі такія чаўны гадоў па пяцьдзясят і болей.**

**Як бачыце, наколькі больш цікавым, багатым і поўным было жыццё думічан таго часу. Мы многа чаго губляем з-за сваёй дурасці, але сёе-тое знішчае час. Час неўміруча ідзе наперад, яго не затрымаеш, міласці да людзей ён не мае. Нічога не зробіш…**

**Адзін раз на год, вясною, у вёску прыходзіла паводка, а на раку – ледаход. Дзень, калі вызваліцца ад лёду рака, чакалі ўсе. Спачатку рака выходзіла з берагоў, вадой залівала ўвесь луг, даходзіла да агародаў і хат Шыманскіх, Жыбуртовічаў, каля магазіна вада падступала да дарогі. Былі гады, калі маразы падоўгу стрымлівалі ледаход, але лішак вады ўсё ж ламаў лёд, і тысячы малых і вялікіх крыг ішло па плыні. Уся вёска выбягала да ракі, асабліва да моста на Капыль. Дарога была метраў на пяць вышэй за ўзровень вады, і вось пры вялікай паводцы крыгі дабіраліся да драўлянага памоста. Да вайны ў паводку былі выпадкі зносу моста. Каб гэта не здарылася, моцныя мужыкі з баграмі стаялі на мосце і на берагах і падштурхоўвалі льдзіны, каб не стварылася затору. І трэба сказаць, малайцы мужчыны: ім удавалася адстаяць цэласнаць моста, а значыць, і дарожны рух на Капыль.**

# К ТАБЕ Я Ў ДУМКАХ ЗАЛЯТАЮ…

## Мой родны кут, як ты мне мілы

Забыць цябе не маю сілы
Не раз, утомлены дарогай
Жыццём вясны маёй убогай
К табе я ў думках залятаю
І там душою спачываю.
Я. Колас «Новая зямля»

З успамінамі пра родныя Думічы мне часцей за ўсё прыходзяць да памяці радкі з паэмы Я. Коласа «Новая зямля», якую першы раз я прачытаў у школе. Ёсць у мяне знаёмы, які на памяць мне чытаў усю паэму, мне гэта было не па сілах. Я пытаюся ў яго:

– Валодзя, як ты запомніў усю паэму?

– А я і не стараўся запамінаць, яна мне гэтак спадабалася, што вершыкі радочкамі самі знайшлі свае месца ў маёй памяці. Выдатнае, прыгожае заўсёды знойдзе сваё месца.

Чытаючы «Новую зямлю», я прыходжу да высновы, што многае пераклікаецца з выглядам родных мясцін. Дарэчы, Я. Колас нарадзіўся ў вёсцы Акінчыцы

**на знакамітым Нёмане, куды нясе свае воды наша Выня, падпітвае, дае сілу.**

**Наша вясковая Капыльшчына ў былыя гады мела падобны выгляд да суседняй Стаўбцоўшчыны. Дарэчы, у 2023 годзе спауняецца стогадовы юбілей «Новай зямлі» Якуба Коласа. Мне здаецца, што Дзяржауны літаратурна – мемарыяльны музей Якуба Коласа правядзе мерапрыемства, дзе будуць гучаць успаміны, неуміручыя Коласавы радкі прыхільнікамі творчасці паэт ды жыхарамі Стаубцоушчыны, нашымі землякамі.**

**Шмат цікавага пра Думічы і саўгас «Лясное» мне расказваў карэспандэнт газеты «Слава працы» Іван Рыгоравіч Ігнатчык. Гадзінамі з захапленнем Іван Рыгоравіч расказваў пра прыроду краю і найбольш працавітых вяскоўцаў. Вельмі ўдзячны Івану Рыгоравічу за добрыя словы пра маіх землякоў. Карыснымі былі яго парады, а таксама некаторыя гістарычныя звесткі пра Думічы. Аб’яднаўшы іх са звесткамі настаўніцы Колас А. І., бацькоў, старэйшых людзей вёскі – Рымашэўскай А. Ф, Матусевіч С. А., Ксяневіч І. А. – я прыйшоў да высновы, што назва вёскі Думічы з’явілася невыпадкова. Існуе паданне аб тым, што ў старажытныя часы на беразе ракі Выня, уздоўж якой і цягнецца вёска, утварылася паселішча племя перасяленцаў. Племя адрознівалася розумам,**

**што і дапамагала яму дабівацца вялікіх поспехаў у гадоўлі жывёлы і земляробстве. Людзі племені ўмела абараняліся ад захопнікаў, спраўна выхоўвалі сваіх дзяцей, умела працавалі ў полі і мелі поспех у развіцці паселішча. Гэта племя назвалі думічамі, а іх паселішча каля ракі Выня – вёскай Думічы.**

**Думічы могуць ганарыцца тым, што ў вёсцы нарадзіўся выдатны дзяржаўны дзеяч Беларусі, адзін са стваральнікаў незалежнай Беларусі – Сташэўскі Аляксандр Восіпавіч (мой дзядзька).**

**Вось што было напісана ў «Славе працы» за 1 жніўня 2009 года: «Каля бурлівай у свой час рэчкі Выня, шумлівых бароў і бярозавых гаёў ляжыць вёска Думічы. Тут ў хаце працавітых сялян нарадзіўся будучы дзяржаўны дзеяч Беларусі Аляксандр Восіпавіч Сташэўскі, 120-годдзе якога адзначаецца сёлета. Саша, як толькі падрос, ва ўсім дапамагаў бацькам, А калі выдавалася вольная хвілінка, блукаў па прыгожых мясцінах думіцкага наваколля. Ён любіў слухаць заліві-стыя трэлі салаўя, шчэбет іншых птушак, акунуцца ў цёлыя хвалі рэчкі, якая падсілкоўвае славуты Нёман. Не раз яму хацелася даплысці ў чоўне да самога бацькі беларускіх рэчак, але на шляху паўставалі Мельнікі са сваім млынам. Ад старажылаў хлопец пачуў, што тут прайшлі дзіцячыя гады класіка яўрэйскай літратуры Мендзеля Мойхер-Сфорыма. Яму было прыемна**

**даведацца, што пісьменнік, як і ён, любіў гэтыя мясціны». Прамое дачыненне да Думіч мае яшчэ адзін мой знакаміты дзядзька, стрыечны брат Сташэускага Аляксандра Восіпавіча – Сташэускі Васіль Пятровіч (11.03.1895г.), беларускі пісьменнік, грамадскі дзеяч. Яго жыццё, грамадская дзейнасць, поспехі і дасягненні прайшлі упоруч са сваім братам. Два браты, пісьменнік і дзяржауны дзеяч, нашы землякі усё жыццё аддалі барацьбе за незалежнасць беларускай дзяржавы, стварэнне органау кіравання краіны, навукі, адукацыі. У 1937 годзе былі арыштаваны і прыгавораны да растрэлу. Рэабілітаваны у 1956 годзе.**

**Мендзель Мойхер-Сфорым нарадзіўся 2 студзеня.1836 года ў Капылі. Лічыцца заснавальнікам сучаснай яўрэйскай літаратуры на мове ідыш. Класік літаратуры на ідышы і іўрыце. Адна з вуліц Капыля названа ў гонар пісьменніка.**

**Як бачыце, думіцкае асяроддзе нарадзіла, выхавала і давала сілы на вялікія справы для выдатных людзей. Вялікай павагі заслугоўваюць усе працаўнікі вёскі за вельмі складаны і цяжкі савецкі перыяд стварэння і развіцця калгаснай гаспадаркі.**

**Узгадаўся адзін выпадак з майго жыцця, звязаны з дзіцячымі ўспамінамі пра думіцкую Выню, выпадак незвычайны, нават сімвалічны.**

**У той час, хто памятае, у Мінску на цэнтральнай**

**плошчы каля будынка Палаца прафсаюзаў быў невялічкі рынак па продажы вырабаў мастацтвааў, у тым ліку карцін мастакоў. Аднойчы пад вечар я завітаў туды, каб купіць сабе ў хату прыгожую замалёўку прыроды. І ў адным куточку мяне як токам працяла: перад вачыма вісела карціна, на якой я ўбачыў нашу пасляваенную Выню за думіцкім мостам, дубочак, пад якім мы гулялі, выгіб рачулкі, за якім некалі стаяла мельніца, высокі правы бераг, з якога прыгалі ў рэчку. Амаль усё да кропачкі, як на Выні. Я доўга стаяў і не верыў сваім вачам, думаў, што, можа, я памыляюся. Але ж не, усё вымалявана так, як было раней. Да мяне падыходзіць пажылая жанчына і пытае: «Што, упадабалі маё мастацтва?» Паміж намі завязалася размова, падчас якой я і распытаў, хто яна, адкуль з'явілася гэта карціна. Аказалася, што мастацкае палатно намаляваў яе муж, які нядаўна памёр. Час тады быў не лепшы, грошай не хапала, і жанчына вымушана была рапрадаваць карціны мужа, які родам быў з-пад Капыля, усё жыццё працаваў мастаком. Гэту карціну ён вельмі любіў, намаляваў яе ў апошнія гады жыцця на дачы недалёка ад Пухавіч, на Пцічы. Калі я расказаў пра сваю Выню, то жанчына з радасцю распавяла, што яе муж у маладосці быў і ў Думічах, і ў Колах, і ў Лёткаўшчыне, і на Выні. Вельмі падобныя мясціны ёсць і на Пцічы, і маляваў ён з натуры адну з іх, толь-**

**кі дадаў юнацкія ўспаміны пра сваю радзіму. На мае сцверджанні, што на палатне адлюстравана думіцкая Выня, яна згадзілася: мастакі свае ўспаміны пераносяць на палатно разам з натуральнымі пейзажамі.**

**Вось такім чынам у маім пакоі на сцяне віціць цудоўная карціна з выявай амаль думіцкай Выні. Кожны дзень яна грэе маю душу цёплымі ўспамінамі.**









# Сташэўскі Аляксандр Восіпавіч з жонкай Таццянай

Форма № 44

87

**ВЕРХОВНЫЙ СУД СОЮЗА ССР**

## ОПРЕДЕЛЕНИЕ № 4н-025403/56

**ВОЕННАЯ КОЛЛЕГИЯ ВЕРХОВНОГО СУДА СССР**

В составе: Председательствующего Полковника юстиции Борисоглебского

и членов: подполковников юстиции Одерова и Петрова

рассмотрела в заседании от 11 июля 1957 г.

Заключение Главного военного прокурора по делу быв. директора Гомельского педагогического института Сташевского Александра Осиповича, 1889 года рождения, уроженца гор. Дубно, [illegible], арестованного 27 апреля 1937 года, осужденного Военной Коллегией Верховного Суда СССР 29 октября 1937 года по ст.ст. 70 и 76 УК БССР к расстрелу с конфискацией имущества.

Заслушав доклад тов. Одерова, заключение пом. Главного военного прокурора подполковника юстиции Логинова, Военная Коллегия Верховного Суда СССР

### Установила:

По приговору суда Сташевский признан виновным в том, что являлся участником национал-фашистской организации и проводил контрреволюционную деятельность.

В заключении ставится вопрос об отмене приговора и прекращении дела по тем основаниям, что в результате дополнительной проверки, проведенной по делу, вновь открылись обстоятельства, опровергающие предъявленные ему обвинения и свидетельствующие о том, что Сташевский был привлечен к уголовной ответственности и осужден необоснованно.

Изучив материалы дела, Военная Коллегия Верховного Суда СССР, соглашаясь с доводами заключения,

### Определила:

Приговор Военной Коллегии Верховного Суда СССР от 29 октября 1937 года в отношении Сташевского Александра Осиповича по вновь открывшимся обстоятельствам отменить и дело о нем в уголовном порядке прекратить за отсутствием состава преступления.

Председательствующий: [signature]

Члены: [signatures]

---

**Военная Коллегия Верховного Суда Союза ССР**

23. августа 1957 г.

№ 4н-025403/56

Москва, ул. Воровского, д. 13.

Форма №

## СПРАВКА

Дело по обвинению СТАШЕВСКОГО Алекса[ндра] Осиповича, работавшего до ареста / 27 апреля 1937 года/ директором Гомельского педагогического института, пересмотрено Военной коллегией Верховного Суда СССР II июля 1957 год[а].

Приговор Военной коллегии от 29 октяб[ря] 1937 года в отношении СТАШЕВСКОГО А.О. по вновь открывшимся обстоятельствам отменен и дело за отсутствием состава преступления прекращено.

СТАШЕВСКИЙ А.О. реабилитирован посмертно.

ПРЕДСЕДАТЕЛЬСТВУЮЩИЙ СУДЕБНОГО СОСТАВА
ВОЕННОЙ КОЛЛЕГИИ ВЕРХОВНОГО СУДА СССР
ПОЛКОВНИК ЮСТИЦИИ [signature]
/ЦЫРЛИНСКИЙ/

Военная Коллегия Верховного Суда СССР

НП

# Дакументы з крымінальнай справы Сташэускага А. В.



Сташевскому Анатолию Иосифовичу
д.Озеро Узденского р-на, Минской области

Уважаемый Анатолий Иосифович !

Ваше предложение об увековечивании имени Сташевского Александра Осиповича, уроженца деревни Думичи Копыльского района , бывшего Наркома внутренних дел БССР, наркома юстиции БССР изучено. Действительно Сташевский А.О. в 1937 году был привлечён к уголовной ответственности и осуждён необоснованно. Его имя реабилитировано в 1957 году.

Вопрос о присвоении одной из улиц имени Сташевского А.О. будет рассмотрен при формировании нового района жилой застройки в городе Копыле.

Заместитель председателя
Копыльского райисполкома А.М.Раевская

Шуранова 55820



Экспазіцыя аб Сташэўскім А. В. у Капыльскім краязнаучым музеі

# з Энцыклапедыі гісторыі Беларусі



**СТАШЭЎСКІ** Аляксандр Восіпавіч [Сташэўскі-Стасевіч; 12(24).3.1889, в. Дулічы Слуцкага пав., цяпер Капыльскі р-н — 11.12.1938], дзяржаўны дзеяч БССР. Скончыў Нясвіжскую настаўніцкую семінарыю (1911), Мінскі Бел. пед. ін-т (1920). У 1911—14 выкладаў у Рэчыцкім пач. прыходскім вучылішчы. У 1-ю сусв. вайну на Паўд.-Зах. фронце, падпаручнік. Пасля дэмабілізацыі з пач. 1918 у Яраслаўлі (Расія), удзельнік бел. нац. руху, чл. арг-цыі *«Маладая Беларусь»*. З кастр. 1918 у Мінску, чл. Бел. партыі сацыялістаў-рэвалюцыянераў. У 1919 сакратар прэзідыума пед. рады Мінскага бел. пед. ін-та, настаўнік 9-й Мінскай бел. школы 1-й ступені. Адзін з ініцыятараў стварэння ў студз. 1920 *Беларускай камуністычнай арганізацыі* (БКА), чл. яе ЦК, уваходзіў у 1-ю Мінскую канспіратыўную «пяцёрку» БКА па арганізацыі антыпольскага падп. і партыз. руху на Міншчыне. Пасля прыходу бальшавікоў у Мінск у ліп. 1920 мабілізаваны ў Чырв. Армію, камандаваў узводам, ротай. З лiст. 1921 сакратар ЦВК і СНК БССР, з ліп. 1924 старшыня Полацкага акр. выканкома, садзейнічаў правядзенню беларусізацыі на далучаных да БССР усх. бел. тэрыторыях. З лют. 1926 нарком унутр. спраў БССР, з вер. 1928 нарком юстыцыі і пракурор БССР. Чл. ЦВК БССР у 1921—31 і яго Прэзідыума ў 1921—24 і 1927—31. Чл. Рэвіз. камісіі КП(б)Б у 1924—25, ЦКК КП(б)Б у 1929—31. У канцы 1930 неабгрунтавана абвінавачаны як удзельнік «антыпартыйнай» групы Ігнатоўскага-Жылуновіча, зняты з пасады і прызначаны старшынёй Бабруйскага райвыканкома. 18.2.1931 выведзены са складу ЦКК КП(б)Б. З восені 1931 заг. рабфака БДУ, потым дырэктар Гомельскага с.-г. пед. ін-та. 27.4.1937 арыштаваны органамі НКУС БССР па абвінавачванні ў антысав. дзейнасці. 29.10.1937 Ваен. калегіяй Вярх. суда СССР прыгавораны да вышэйшай меры пакарання. Рэабілітаваны ў 1956.

*Уладзімір Ляхоўскі, Яўгенія Фалей.*

**СТАШЭЎСКІ** Васіль Пятровіч [Базыль Сташэўскі; 11(23).3.1895, в. Свінка Слуцкага пав. Мінскай губ., цяпер в. Лутавая Капыльскага р-на — 29.10.1937], бел. пісьменнік, грамадскі дзеяч. Скончыў Нясвіжскую настаўніцкую семінарыю (1914), Мінскі настаўніцкі ін-т (1924). У 1918—20 і ў 1923 настаўнік. Уваходзіў у арг-цыю *«Маладая Беларусь»*, партыю бел. эсэраў (БПС-Р), са студз. 1920 чл. *Беларускай камуністычнай арганізацыі*. У час савецка-польскай вайны 1920 удзельнік антыпольскага руху на Случчыне. З жн. 1920 чл. КП(б)Б, заг. аддзела Мінскага пав. выканкама, выконком Мінскага тэр. палка. Выступіў супраць арыштаў членаў БПС-Р, за што ў маі 1921 выключаны з КП(б)Б, працаваў заг. бел. пададдзела Мінскага пав. аддзела нар. асветы. Пасля заканчэння ін-та выкладаў на настаўніцкіх курсах і на рабфаку ў Оршы, узначальваў культаддзел Аршанскага акр. савета прафсаюзаў. З 1926 у Мінску, працаваў адказным сакратаром літ. аб'яднання *«Маладняк»*, у 1928—29 — у газ. «Савецкая Беларусь», з 1929 адказны сакратар літ. аб'яднання *«Полымя»*. У 1937 арыштаваны і прыгавораны да вышэйшай меры пакарання. Рэабілітаваны ў 1957. Друкаваўся з 1923. Першую п'есу «На другі дзень» апубл. у 1926 у час. «Аршанскі маладняк». Аўтар больш як 20 п'ес: «Бацька і сын» (1927), «Музыка Цвілеўскі» і «Спявай, вясна!» (1928), «На варце» (1932), «Мікола Гоман» (паст. Бел. тэатрам юнага гледача ў 1936) і інш. Выдаў кнігі прозы: «Пад мястэчковым месяцам» (1931), «Шуміць бярэзінка» (1933), зб-кі нарысаў «Па сонечным шляху» (1930), «Калгасная зямля» (1932) і інш. П'есы для дзяцей. Літ. творчасць вызначалася вострай сац. накіраванасцю, публіцыстычнасцю, рэалізмам адлюстравання жыцця. З пач. 1930-х г. у творах С. адчуваўся моцны вульгарызатарскі ўплыў, ідэалаг. вульгарызацыя рэчаіснасці.

*Тв.:* Гаворыць Асінстан... Мн., 1930; Шуміць бярэзінка. Мн., 1963.

*Літ.:* Александровіч С. Жывыя старонкі часу // Полымя. 1963. № 12; Ватацы Н. Б. Беларуская савецкая драматургія: Бібліягр. Мн., 1967; Сабалеўскі А. Васіль Сташэўскі // Хрэстаматыя па гісторыі беларускага тэатра і драматургіі. Мн., 1975. Т. 2.

*Іван Чыгрын, Уладзімір Ляхоўскі.*

**Экспазіцыя аб Сташэускім А. В. у Капыльскім краязнаучым музеі**



ГІСТАРАЧНЫ ЭКСКУРС

Вёска Думічы знаходзіцца ў Бабаўнянскім сельсавеце Капыльскага раёна, за 10 км на поўнач ад г. Капыль, 118 км да г. Мінск.

Вёска стаіць на шашы «Баранавічы-Асіповічы» і перасячэнні з шашой «Узда – Пясочнае – Капыль».

Звесткі з гісторыі развіцця:

– у канцы XVIII ст. вёска ў Слуцкім павеце Мінскай

**губерніі;**

**– у 1800 г. – 52 гаспадаркі, 188 жыхароў (шляхецкая ўласнасць);**

**– у 1892 – уласнасць дзяржавы;**

**– у другой палове XIX ст. у Целядавіцкай воласці Слуцкага павета;**

**– у 1908 г. – 72 гаспадаркі, 440 жыхароў, мельніца, кузня;**

**– у 1911 г. адкрыта земскае народнае вучылішча;**

**– у 1917 г. – 99 гаспадарак, 494 жыхара;**

**– у студзені 1921 г. пачала працаваць школа першай ступені, 1 настаўнік, 45 вучняў;**

**– з 20.08.1924 г. вёска Думічы – у Капыльскім сельсавеце Капыльскага раёна, 110 гаспадарак, 467 жыхароў, школа першай ступені, 1 настаўнік, 73вучні;**

**– у 1926 г. – 465 жыхароў;**

**– у 1929 г. створаны калгас «Культура» – адзін з першых у раёне;**

**– з 1938 г. – у Мінскай вобласці;**

**(Даведачна: у гады Вялікай Айчыннай вайны на франтах забіта 29 жыхароў)**

**– з 09.1944 г. – у Бабруйскай воласці;**

**– з 01.1954 – у Мінскай вобласці;**

**– з 24.05.1960 – у Бабаўлянскім сельсавеце, у саўгасе «Лясное», 373 жыхары;**

**– у 1997 г. – 93 гаспадаркі, 178 жыхароў;**

**– у 2010 г. – 56 гаспадарак, 110 жыхароў;**

**– на 01.2023 г. колькасць жыхароў вёскі занчна паменшылася.**

**Памірае вёска, памірае ўсё, што далёка ад гарадоў. Моладзь уцякае ў горад, там ёсць работа, заробак, цывілізацыя, там лягчэй гадаваць дзяцей. У вёсцы няма працаздольных людзей, застаюцца дажываць свой век пенсіянеры.**

**Мяне цікавіць іншае: чаму, калі жыццё ў вёсцы стала значна лепшым, сяльчане сталі адракацца ад працы на зямлі і аддалі перавагу гораду?**

**У цяжкія дарэвалюцыйныя гады, у 1908 годзе, у Думічах у 72 гаспадарках жыло, працавала 440 жыхароў, была мельніца, кузня, адкрыта земскае народнае вучылішча.. У 1917 г. у школе навучалася 45 вучняў, а ў 1924 г. – ужо 73 вучні.**

**Магчыма, я і памыляюся, але адказ на пытанне я бачу ў паэме Я Коласа «Новая зямля» – энцыклапедыі жыцця беларускага сялянства XIX-XX стагоддзяў. Якуб Колас пачаў пісаць твор, калі рыхтавалася сталыпінская аграрная рэформа, і яго гісторыя непасрэдна звязана з тым, як вырашалася зямельнае пытанне ў Расійскай імперыі, а пазней у СССР.**

# Конец ознакомительного фрагмента.

Текст предоставлен ООО «Литрес».

Прочитайте эту книгу целиком, купив полную легальную версию на Литрес.

Безопасно оплатить книгу можно банковской картой Visa, MasterCard, Maestro, со счета мобильного телефона, с платежного терминала, в салоне МТС или Связной, через PayPal, WebMoney, Яндекс.Деньги, QIWI Кошелек, бонусными картами или другим удобным Вам способом.